■ Падземка

З ПРАЯЗНЫМ — «МІМА КАСЫ»

З 1 красавіка ў сталічным метро ўвядуць праязныя білеты на аснове бескантактнай смарт-карткі (БСК). Калі раней, набываючы праязны на некалькі відаў транспарту, пасажыр атрымліваў картку на метро і папяровы білет, то цяпер гэта будзе адзіны носьбіт на аснове БСК. З цягам часу іх можна будзе папаўняць самастойна, не звяртаючыся ў касы.

Пра гэта расказаў журналістам падчас прэс-канферэнцыі начальнік камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі метрапалітэн» Расціслаў Юрэня.

— Хутка на станцыі метро «Плошча Леніна» ў тэставым рэжыме запрацуе інфакіёск, дзе можна будзе папаўняць свой электронны праязны. Прычым вы маеце магчымасць набываць яго як на дэкаду, палову месяца ці месяц, так і на пэўную колькасць паездак з тэрмінам дзеяння 60 сутак. У першую чаргу гэта будзе зручна людзям, якія рэдка карыстаюцца транспартам. Для таго, каб папоўніць праязны праз інфакіёск, спатрэбіцца сама БСК і банкаўская картка, на якой ёсць як мінімум неабходная для «абнаўлення» праязнога сума, — распавёў Расціслаў Юрэня.

Адмаўляцца ад выкарыстання жэтонаў, як гэта зрабілі ў Маскве, у беларускай сталіцы пакуль не плануюць. Начальнік Мінскага метрапалітэна падкрэсліў, што сёння гэта самы просты і зручны сродак аплаты. 58 працэнтаў пасажыраў карыстаюцца не праязнымі, а менавіта жэтонамі.

Дарэчы, каб паездкі ў метро былі акупнымі, за адну пасажыры павінны аддаваць больш за 4,5 тысячы рублёў. Калі параўноўваць цяперашні кошт аднаго жэтона на метро ў Беларусі і ў краінах-суседках, то плаціць больш чым удвая (у пераводзе на беларускія рублі) даводзіцца жыхарам Масквы (8,3 тысячы) і Санкт-Пецярбургу (7,8 тысячы), а танней, чым у Мінску, паездка ў метро абыходзіцца ў Кіеве і Днепрапятроўску (крыху больш за 2 тысячы рублёў).

Сёння Мінскі метрапалітэн налічвае больш за 4 тысячы супрацоўнікаў. За дзень сталічным метро карыстаецца ў сярэднім 890 тысяч чалавек. Ездзяць пасажыры ў 337 вагонах. У бліжэйшы час плануецца набыць яшчэ 25. Сярэдняя хуткасць, з якой рухаюцца цягнікі ў беларускім метро, — 41 кіламетр у гадзіну.

Ганна ГАРУСТОВІЧ

■ Нечакана!

ЮРТА ДЛЯ... ПТУШКІ!

Што ўяўляе большасць з нас, калі размова заходзіць пра кармушку? Часцей за ўсё гэта «дамок» з фанеры, разрэзаная пластыкавая бутэлька ці кардонны пакет з-пад малака. У Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ на звыклы спосаб уратаваць птушак ад голаду паспрабавалі паглядзець па-іншаму і зладзілі з гэтай нагоды выставу.

Кармушка «Мулявін» прыцягнула ўвагу наведнікаў незвычайнай выставы.

...Першае, што адразу кінулася ў вочы і аб'ектыў фотакамеры — вусаты шарападобны «зубасцік» з яркай афарбоўкай. У кармушкі з такім дызайнам аказалася не менш нечаканая назва — проста «Валера».

— Гэтая кармушка аддалена нагадвае калабка, надзеленага чалавечымі рысамі, але ў больш брутальным увасабленні, — так тлумачыла сваё рашэнне аўтарка Дзіяна Карнейка.

У гонар каго атрымаў сваё імя «брутальны калабок», так і засталося загадкай.

Вераніка Папковіч паказвае сваю кармушку Яўгеніі Тумель.

Проста «Валера».

А вось кармушка, зробленая трэцякурсніцай Вольгай Несцярэнкай, навеяла думкі пра далёкі загадкавы край. З кардону, зубачыстак і суравых нітак дзяўчына змайстравала юрту.

Падтрымала «падарожную» тэму Аляксандра Квілорыя, якая з кітайскіх палачак для яды стварыла... «Індзейскую хаціну».

— Такі дызайн будзе нагадваць птушкам пра цёплыя краіны, — лічыць дзяўчына.

А Аліна Навіцкая вырашыла стварыць кармушку ў выглядзе казачнай хаткі на курыных ножках. «Казка казкай, а абед па раскладзе», — менавіта так гучыць назва работы.

Не менш казачнай здалася і праца Алены Вільданавай, але тут ужо размова пра колеравае рашэнне. Яркі шматграннік пад назвай Fire Box, на думку аўтаркі, можа быць не проста кармушкай, але і ўпрыгажэннем дрэў.

А як вам кармушка незвычайнай канструкцыі з выразанай з дрэва гітарай ці гербам «Пагоня», а таксама з партрэтамі выбітных прадстаўнікоў беларускай гісторыі і культуры? Адна з прац мае назву «Мулявін», а другая — «Каліноўскі». На думку аўтара, кандыдата мастацтвазнаўства, дацэнта кафедры мастацтваў Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ Яўгена Марозава, створаныя ім аб'екты маглі б упрыгожыць дрэвы на сталічных вуліцах Мулявіна і Каліноўскага.

Усіх работ, зразумела, не пералічыш, але цікава, якую з кармушак упадабалі б самі птушкі?

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

КАНКУРЭНЦЫЯ — У ГАРАДСКІ І АБЛАСНЫ САВЕТЫ, У СЕЛЬСКІЯ — БЕЗ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

Усяго ў Брэсцкай вобласці павінны быць абраны 3042 дэпутаты мясцовых Саветаў. З іх — 57 у абласны Савет, 512 — у раённыя, 186 — у гарадскія Саветы, 2287 — у пасялковыя і сельскія. Рэгістрацыю прайшлі 3339 прэтэндэнтаў на дэпутацкія мандаты. Больш за палову з іх — дзеючыя дэпутаты.

Пасля рэгістрацыі стала зразумела, што ў адных округах будзе разгорнута барацьба за званне народнага выбранніка, а ў другіх выбары пройдуць без альтэрнатывы. Апошняе датычыць сельскіх і пасялковых Саветаў, дзе амаль паўсюдна зарэгістраваны адзін кандыдат на месца. А вось на 40 месцаў у Брэсцкім гарадскім Савеце прэтэндуе 121 кандыдат. А ў Брэсцкі абласны Савет конкурс складае ў сярэднім 2,1 чалавека на месца. Напрыклад, у Брэсцкай акрузе №10 у абласны Савет балаціруецца адразу пяць кандыдатаў.

Варта адзначыць, што ў Брэсцкай вобласці кандыдатамі ў дэпутаты зарэгістраваны 121 чалавек, вылучаны партыямі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

70 ГАДОЎ ТАМУ

Рагачоў адзначыў 70-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Горад быў заняты байцамі 1-га Беларускага фронту 24 лютага 1944 года, а ў выніку правядзення аперацыі «Баграціён» было канчаткова завершана вызваленне Рагачоўшчыны ад фашыстаў. 55 воінам тады было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Урок мужнасці і міру прайшоў у рагачоўскай сярэдняй школе № 2 з удзелам прадстаўнікоў Гомельскага аддзялення Беларускага фонду міру. Кіраўніцтва Рагачоўскага райвыканкама правяло ўрачысты прыём для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Таксама ў горадзе на Дняпры адбылося святочнае шэсце працоўных калектываў да мемарыяла вайсковай славы. Сярод удзельнікаў шэсця былі і школьнікі. Яны пранеслі па вуліцах горада партрэты сваіх родных, якія ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і не дажылі да нашых дзён. Паказальныя выступленні 120-й Рагачоўскай спецыялізаванай брыгады і канцэртная праграма ў раённым Палацы культуры завяршылі святочныя мерапрыемствы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ

За студзень-люты гэтага года на вадаёмах Брэсцкай вобласці загінула восем чалавек.

Чацвёра з іх не паклапаціліся аб захаванні правілаў бяспекі. Ні адзін з рыбакоў не быў апрануты ў выратавальную камізэльку. А двое знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення.

Як паведамілі ў абласным савеце таварыства выратавання на водах, іх спецыялістамі за гэты час было выратавана чацвёра рыбакоў (двое з аматараў зімовай лоўлі рыбы аказаліся нападпітку). Выратавальнікі папярэджваюць, што цяпер лёд (асабліва ў паўднёвых раёнах краіны) вельмі тонкі. Так што лепш не рызыкаваць.

Яна СВЕТАВА.

ЧАМУ ПАЛЫХНУЛА ФЕРМА?

Супрацоўнікі МНС разам з работнікамі фермы выратавалі 190 галоў буйной рагатай жывёлы.

Паведамленне пра загаранне на тэрыторыі малочнатаварнай фермы ў вёсцы Палосы Лагойскага раёна паступіла а палове першай ночы. У службу «101» тэлефанавала мясцовая жыхарка. Калі на месца прыбылі выратавальнікі, дах фермы гарэў на плошчы 200 квадратных метраў. Супрацоўнікі МНС разам з работнікамі фермы выратавалі 190 кароў. У выніку пажару агнём пашкоджаны дах над малочным блокам на плошчы 375 квадратных метраў, выгаралі знутры службова-бытавыя памяшканні і малочны блок кароўніка. Пры загаранні пасцельнай бялізны ў памяшканні вартоўні атрымаў апёкі 10 працэнтаў цела вартаўнік, мужчына 1966 года нараджэння. Па інфармацыі Мінскага абласнога ўпраўлення МНС, яго шпіталізавалі ў стане сярэдняй цяжкасці. Прычына пажару ўстанаўліваецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Падрабязнасці

ПСЕЎДАМІНЁРУ МАЛАДЗЕЧАНСКІХ ШКОЛ ПАГРАЖАЕ 7 ГАДОЎ ТУРМЫ

Следчы камітэт завяршыў расследаванне справы аб ілжывым мініраванні 11 школ у Маладзечне. Гаворка ідзе пра перапалох, які адбыўся 5 верасня мінулага года. Менавіта ў гэты дзень на электронную пошту маладзечанскіх школ прыйшлі лісты з пагрозай.

Ананім патрабаваў перавесці на пэўны рахунак 10 тысяч долараў, інакш ён узарве бомбу. Вучні і персанал імгненна пакінулі будынкі сваіх навучальных устаноў, а супрацоўнікі МУС і МНС пачалі шукаць выбуховую прыладу. Але, на шчасце, не знайшлі. Неўзабаве па гарачых слядах затрымалі адпраўніка лжывых лістоў. Ім аказаўся 30-гадовы ўраджэнец Маладзечанскага раёна.

— Як высветлілася, малады чалавек, каб адпомсціць свайму знаёмаму, ад яго імя зарэгістраваў электронную скрыню і электронны паштовы кашалёк, — паведаміла афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Беларусі па Мінскай вобласці Таццяна Беланог. — Пасля гэтага напісаў 11 лістоў з пагрозамі і разаслаў іх у навучальныя ўстановы.

Судзіць псеўдамінёра будуць за несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі, здзейснены з асабістай зацікаўленасці, а таксама за загадзя лжывае паведамленне пра мяркуемы выбух, што пацягнула нанясенне шкоды ў буйным памеры. Дарэчы, выдаткі, звязаныя з прыпыненнем заняткаў у школах і працай аператыўных службаў, склалі больш як 119 мільёнаў рублёў. Затрыманаму пагражае да сямі гадоў калоніі.

Надзея ПАЎЛАВА

■ Да ведама

НЯМА ВАКЗАЛА, НЯМА І ТАРЫФНАГА ПУНКТА

Ужо паведамлялася, што сталічны аўтавакзал «Маскоўскі» будзе закрыты, у сувязі з чым у схеме транспартнага абслугоўвання плануюцца змены. Вось чарговая з іх.

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», з 20 мая будзе скасаваны тарыфны пункт «Мінск АВ-3 «Маскоўскі» ў абодвух напрамках руху аўтобусаў па маршрутах: Мінск — Масква на рэйсы адпраўленнем з Мінска ад АВ «Цэнтральны» ў 20.30 — па серадах і чацвяргах (з Масквы з 20 мая ад АВ «Шчолкаўская» ў 20.40 па чацвяргах і пятніцах); Мінск — Талін — аўтобусы будуць адпраўляцца з нашай сталіцы толькі ад АВ «Цэнтральны» ў 16.30 па пятніцах (з Таліна ў 16.00 па суботах); Мінск — Санкт-Пецярбург — аўтобусы будуць адпраўляцца з Мінска толькі ад АВ «Цэнтральны» ў 17.00 (з Санкт-Пецярбурга ў 18.00) па ўсіх днях тыдня. Рух аўтобусаў па маршрутах Мінск — Рыга будзе наступным: з Мінска — толькі ад АВ «Цэнтральны» ў 9.20 (з Рыгі ў 7.55) штодня; з Мінска ад АВ «Усходні» ў 22.10, ад АВ «Цэнтральны» ў 22.30 (з Рыгі ў 21.20) штодня, акрамя аўторка.

Сяргей РАСОЛЬКА